УДК 004

М.В. Балакір, І.Ц. Ярмак, А.К. Гармаза

# ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ СІСТЭМЫ ДЫСТАНЦЫЙНАГА НАВУЧАННЯ НА КАФЕДРЫ БЯСПЕКІ ЖЫЦЦЯДЗЕЙНАСЦІ

Асноўнымі дысцыплінамі, выкладаемымі на кафедры бяспекі жыццядзейнасці (БЖД), з'яўляюцца "Абарона насельніцтва і аб'ектаў ад надзвычайных сітуацый. Радыяцыйная бяспека", "Ахова працы", "Бяспека жыццядзейнасці чалавека". Яны выкладаюцца студэнтам усіх спецыяльнасцяў і формаў навучання. У сувязі з увядзеннем новых вучэбных планаў, згодна з якімі значна зменшылася колькасць лекцыйных заняткаў, а таксама ліквідавалася здача пісьмовых кантрольных работ, для студэнтаў завочнага факультэта паўстала неабходнасць у больш паглыбленай самастойнай падрыхтоўцы, якая патрабуе своечасовасці і самакантролю вывучэння дысцыплін. Для вырашэння дадзенай праблемы актуальна развіццё сістэмы дыстанцыйнага навучання (СДН), што дазволіць студэнтам у міжсесійны перыяд сістэматычна вывучаць неабходную дысцыпліну з правядзеннем кантролю ведаў, выконваючы тэсты.

Наступным этапам развіцця СДН на кафедры БЖД з'яўляецца ўкараненне сучасных тэхналогій у навучальны працэс для слухачоў Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі па спецыяльнасці "Ахова працы ў лясной гаспадарцы і вытворчасці вырабаў з драўніны", так як больш за 70 % аўдыторных заняткаў для гэтай спецыяльнасці праводзіцца на кафедры БЖД. Варта ўлічваць той факт, што навучанне па дадзенай спецыяльнасці ажыццяўляецца з адрывам ад вытворчасці, а экзаменацыйная сесія працягваецца прыкладна месяц і многія слухачы з'яўляюцца іншагароднімі жыхарамі. Таму мэтазгодна часткова зменшыць аўдыторную вучэбную нагрузку праз выкарыстанне дыстанцыйных метадаў навучання.

Згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб ахове працы», кіраўнікі і спецыялісты не радзей аднаго разу ў тры гады праходзяць праверку ведаў па пытаннях аховы працы. Такім чынам, яшчэ адным напрамкам у развіцці СДН на кафедры БЖД з'яўляецца дыстанцыйнае навучанне кіраўнікоў і спецыялістаў па пытаннях аховы працы. Галоўнымі станоўчымі бакамі аддаленага навучання з'яўляюцца: адсутнасць неабходнасці ў паездках на месца вучобы; шырокая праграма навучання; матэрыяльная даступнасць і інш.